**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у студзені**

Бібліятэкі ДУК “Лунінецкая РЦБС” далучыліся да **рэспубліканскай дабрачыннай акцыі для пажылых людзей “Ад усёй душы”**.

**10 студзеня. ЦБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі наведалі на даму 3 чытаючыя сям’і. Акрамя кніг усе пажылыя чытачы атрымалі сувініры-магніты і інфармацыйныя буклеты “Лунінецкая центральная раённая бібіятэка”.

Таксама наведалі сваіх чытачоў на даму бібліятэкары Люшчанскай сельскай бібліятэкі – клуба, Рэдзігераўскай і Палескай сельскіх бібліятэк.

У перыяд зімовых святаў у РЦБС прайшлі традыцыйныя **святочныя мерапрыемствы**.

**12 студзеня. ЦБ.** У чытальнай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі адбыўся пазнавальна-літаратурны вечар «Святкі-калядкі», удзельнікамі якога сталі навучэнцы 7 “Б” класа сярэдняй школы №3. Пачаткам мерапрыемства стала выступленне бібліятэкара з расповедам пра гісторыю і традыцыі свята, абрад калядавання. Затым дзеці з цікавасцю прагледзелі відэа-агляд аб абрадах калядавання ў розных абласцях нашай краіны. Вядучая вечара зачытала традыцыйныя калядныя песні-шчадроўкі. Самыя смелыя з удзельнікаў мерапрыемства праспявалі калядныя песні. Кульмінацыяй вечара стала квэст-гульня “Прадказанне лёсу”.

Прайшлі святочныя мерапрыемствы ў сельскіх бібліятэках. У Любачынскай с.б. – фальклорная вечарына “Гуляй на Святкі – прыйшлі Калядкі”, у Люшчанскай сельскай бібліятэцы-клубе – калядная вечарына “Каляда-калядніца, прыходзь павесяліцца”, у Вулькаўскай-1 с.б. – фальклорна-этнаграфічная вечарына “Святочныя Калядкі” і інш.

**12 студзеня. Мікашэвіцкая г.б.** У бібліятэку завіталі калядоўшчыкі – удзельнікі клуба маладых інвалідаў “САМІ”. Яны прынялі ўдзел у забаўляльна-гульнявой праграме “Наступили святки – начались Колядки”. Калядоўшчыкі выканалі калядныя песні і вершы, прадэманстравалі аўтэнтычныя традыцыі калядавання ў нашай мясцовасці. Бібліятэкар расказала удзельнікам мерапрыемства пра гісторыю святочных каляд.

**19 студзеня. ЦБ.** У чытальнай зале бібліятэкі адбылася пасяджэнне народнай літаратурна-паэтычнай студыі “Літаратурная правінцыя”. Кіраўнік студыі Віктар Пінігін расказаў пра гісторыю калядных святаў – Ражства Хрыстова, Вадахрышча, пра традыцыю калядавання, пра калядныя варожбы. Прысутныя паўдзельнічалі ў гульні “Прадказы”. Затым усе ўдзельнікі мерапрыемства выступалі са сваімі творамі на тэму Калядаў.

**18 студзеня. ЦБ.** Адбыўся Адзіны дзень інфармавання па тэме “Год качества – залог успеха социально-экономического развития страны». Актуальную тэму абмеркавалі супрацоўнікі цэнтральнай раённай і цэнтральнай дзіцячай бібліятэк на сустрэчы з Анатолем Міхайлавічам Захаркевічам, намеснікам старшыні Лунінецкага райвыканкама.

Прайшлі мерапрыемствы да **Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту.**

**25 студзеня. ЦДБ.** У бібліятэцы адбыўся дзень памяці “Холокост – трагедия народа” для вучняў СШ №1. Прысутныя даведаліся пра асноўныя паняцці, звязаныя з трагедыяй Халакоста, храналогіяй гэтых трагічных падзей і тым, што паслужыла падставай для масавага знішчэння людзей. Даведаліся аб шматлікіх ахвярах фашызму, аб жорсткім знішчэнні яўрэйскага народа ў лагерах смерці. Рабятам быў прадэманстраваны відэаролік аб нацысцкім лагеры Бухенвальд.
**26 студзеня. ЦБ.** Для вучняў 9 “А” класа гімназіі ім.Анцукевіча супрацоўнікі бібліятэкі правялі гадзіну памяці “Помни, не забудь!” На мерапрыемства запрасілі краяведа і журналіста Таццяну Васільеўну Канапацкую. Яна расказала навучэнцам пра знішчаныя вёскі ў нашым раёне ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
**26 студзеня. Мікашэвіцкая г.б.** Адбылася літаратурная гадзіна “Без права на забвение” для вучняў 9 “А” класа СШ №2. Дзецям расказалі пра лагеры смерці, дзе знішчалі яўрэйскае насельніцтва. Асобую ўвагу удзялілі інфармацыі пра Лахвенскае і Мікашэвіцкае гета.
У сельскіх бібліятэках раёна таксама прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Міжнароднаму дню памяці ахвяр Халакосту: гадзіна-рэквіем “Память, которой не будет забвения” (Дрэбская сельская бібліятэка-клуб), урок памяці “Холокост – трагедия поколений” (Лунинская сельская библиотека), гадзіна-рэквіем “Холокост: память поколений” (Любачынская сельская бібліятэка), гадзіна памяці “Помни, не забудь!” (Бастынская сельская бібліятэка).